**Галіна Флікоп-Світа**

# Ілюзорныя іканастасы ўніяцкіх храмаў Беларусі (апошняя трэць XVIII – пачатак XIX ст.)

**Halina Flikop-Svita**

**Illusory iconostasis of the Uniate churches in Belarus (the last third of the 18th – beginning of 9th century)**

The article is devoted to a unique artistic phenomenon, which emerged and existed in the context of the Uniate Church in the last third of 18th – early 19th c., illusory iconostasis. Until recently the existence of these sacred pieces of information did not exist. Based on archival sources found that in different regions of Belarus at the turn of 18th – early 19th c there existed the iconostases, executed with the use of illusory painting. The article presents quotes from archival sources, which indicate the existence of such cult objects as well as to illustrate using the unique picture that is able to represent the view illusory iconostases.

*Keywords:* Greek Catholic Church, iconostasis, illusory painting

**Ілюзорний іконостас уніатських церков Білорусі (остання третина XVIII – початок XIX ст.)**

Стаття присвячена унікальному художньому явищу, яке виникло й існувало в контексті уніатської церкви в останній третині XVIII – на початку XIX ст., ілюзорний іконостас. На підставі архівних джерел встановлено, що в різних регіонах Білорусі на межі XVIII – XIX ст. існував іконостас, виконаний з використанням ілюзорного живопису. У статті представлено цитати з архівних джерел, які вказують на існування таких культових об'єктів, а також за допомогою унікальної картини проілюстровано вид ілюзорного іконостаса.

*Ключові слова*: греко-католицька церква, іконостас, ілюзорний живопис

Адно з цікавых пытанняў, якое паўстае перад даследчыкамі ўніяцкай Царквы, датычыцца іканастасаў гэтай канфесіі. У нашых артыкулах мы ўжо звярталіся да такога аспекту, як іх наяўнасць або адсутнасць у храме; былі зроблены спробы прасачыць лакальныя варыянты абсталявання храмавых інтэр'ераў, здзейснена выяўленне прычын, якія ўплывалі на захаванне або знікненне іканастасаў на працягу Уніі з бажніц гэтай

канфесіі[1]. Аднак нязменна перад навукоўцамі паўстае і іншае пытанне: ці адрозніваўся ўніяцкі іканастас ад праваслаўнага, ці меў ён выключна свае рысы, якія сфарміраваліся менавіта ў рэчышчы Уніі.

Спробу даць адказ здзяйснялі некаторыя даследчыкі, якія вывучалі іканапіс названай канфесіі і архітэктуру яе храмаў. Так, яшчэ ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. у артыкулах Ю. В Хадыкі сустракаюцца назіранні пра ўніяцкі іканастас. На думку навукоўцы, адрозненне ўніяцкага іканастаса ад праваслаўнага заключаецца ў тым, што ў першым з названых дэісусны чын быў заменены апостальскім, які разам з абразамі, змешчанымі па вертыкалі, утваралі крыжовы кампазіцыйны стрыжань, пры гэтым цалкам мяняючы ідэалагічную праграму ўсяго комплекса. З гэтым назіраннем, мы, на жаль, пагадзіцца не можам, бо ва ўсіх знаёмых нам захаваных іканастасах, а таксама страчаных, але вядомых па фотаздымках і чарцяжах, крыжовая аснова не прасочваецца, а выразна бачна вертыкальная вось, якая праходзіць праз Царскую Браму і цэнтральныя абразы кожнага з верхніх чыноў[2].

Што дытычыцца замены дэісуснага чына апостальскім ва ўніяцкую эпоху, то пра гэта сцвярджаць немагчыма, бо няма падрабязных звестак пра склад беларускіх іканастасаў у ранейшы перыяд. Тыя адзінкавыя апісанні канца XVI – пачатку XVII ст., якія захаваліся да нашага часу, сведчаць пра наяўнасць «Дэісуса» ў тураўскім і пінскім саборных праваслаўных храмах, але пад гэтым паняццем тагачасныя складальнікі маглі мець на ўвазе не толькі кананічны дэісусны чын, але і апостальскі, які развіўся як трансфармацыя першага[3].

З мастацтвазнаўцаў пэўныя назіранні адносна структуры і асаблівасцяў уніяцкіх іканастасаў выказваў А. А. Ярашэвіч, які адзначыў, што найбольш тыповым беларускім (у тым ліку і грэка-каталіцкім) іканастасам у XVII–XVIII ст. з’яўляецца канструкцыя ў тры – чатыры чыны[4]. Аднак на нашую думку, найбольш пашыранымі ў гэты перыяд структурамі ў храмах названай канфесіі былі нізкія: адна- і двух’ярусныя. Таксама даследчык адзначыў, што даволі часта ў іканастасах уніяцкіх цэркваў здымалася Царская Брама, каб зрабіць даступным для агляду вернікаў алтар, размешчаны за іканастасам у віме[5]. Безумоўна, такія выпадкі маглі мець месца, але зноў-жа, з архіўных крыніц нам вядомы іншыя спосабы вырашэння гэтай праблемы, пра што будзе адзначана ніжэй.

Стылістыцы іканастасаў асобных, найбольш знакавых у гісторыі архітэктуры, уніяцкіх цэркваў прысвечаны артыкулы І. М. Ажэшкоўскай.

Даследчыца звяртаецца да праблемы ўладкавання ўнутранай храмавай прасторы грэка-каталіцкіх бажніц, выяўляючы прыкметы сінтэзу заходніх і ўсходніх традыцый, на падставе чаго імкнецца вызначыць тыя мастацкія і сакральныя рысы, якія сфарміраваліся ў рэчышчы Уніі[6].

Цікавыя назіранні пра асаблівасці ўніяцкага іканастаса выказала даследчыца сакральнай архітэктуры Т. В. Габрусь[7]. Гэта датычыцца ўзнікнення ў некаторых уніяцкіх цэркваў алтарнай агароджы, якая аддзяляла віму ад асноўнай прасторы храма (выконвала тую ж функцыю, што і традыцыйны іканастас), але сваім мастацка-вобразным ладам, архітэктонікай і кампазіцыяй яна мела больш агульнага з прысценнымі алтарамі. Такія алтарныя агароджы можна з упэўненасцю лічыць з’явай выключна ўніяцкай, аднак неабходна адзначыць, што яны не з’яўляюцца тыповымі для большасці бажніц гэтай канфесіі, дзе працягвалі захоўвацца выкананыя з дошак іканастасы.

Як бачна з прыведзеных вышэй звестак, назіранні адносна іканастасаў уніяцкіх храмаў з’яўляюцца даволі разрозненнымі, часам – супярэчлівымі. Гэта тлумачыцца тым, што мэтанакіравана да дадзенай праблематыкі навукоўцы не звярталіся, а закраналі дадзенай пытанне пры вывучэнні блізкіх аспектаў: уніяцкага іканапісу або архітэктуры. Такім чынам, пытанне пра ўніяцкія іканастасы, іх асаблівасці і характэрныя рысы дагэтуль застаецца не вырашаным і вымагае асобнага, даволі пільнага, разгляду.

У дадзеным артыкуле будзе здзейснена спроба вывучэння аднаго з тыпаў уніяцкага іканастаса. Будуць прадэманстраваны (з дапамогай іканаграфічнай крыніцы і гістарычных апісанняў) прыклады, якія, на нашую думку, уласцівыя выключна грэка-каталіцкай царкве. Аднак адразу ж неабходна зрабіць агаворку, што адначасова з «незвычайнымі» іканастасамі, якія сфарміраваліся ў рэчышчы Уніі, у храмах гэтай канфесіі існавалі і традыцыйныя іканастасы, якія ў гэты ж перыяд былі ўласцівы і праваслаўным храмам нашых земляў. Разам з тым, у грэка-каталіцкіх цэрквах выпрацоўваліся свае мастацкія формы і тэхнічныя прыёмы для вырабу гэтай сакральнай канструкцыі. У дадзеным артыкуле будзе разгледжаны адзін з тыпаў уніяцкіх іканастасаў, пра існаванне якога да цяперашняга часу не было ніякіх звестак. Гэта тлумачыцца тым, што іканастасы такога тыпу, пра які гаворка будзе весціся ніжэй, увогуле не захаваліся да нашага часу. А пра іх існаванне стала вядома з архіўных крыніц.

Для дадзенага даследавання былі выкарыстаны матэрыялы з архіваў Беларусі, Расіі і Літвы: Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (г. Мінск), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродна, Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (г. Вільнюс), Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (г. Санкт-Пецярбург), архіва Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук (г. Санкт-Пецярбург). Трэба адзначыць, што пры вывучэнні названай мастацтвазнаўчай праблемы вялася праца з гістарычнымі крыніцамі і з іншых сховішчаў, аднак з-за адсутнасці ў іх патрэбных для разгляду звестак пра гэтыя дакументы мы не згадваем. Такім чынам, сярод апрацаваных матэрыялаў XVIII–XIX ст., а для разгляду мы бралі пратаколы праверак уніяцкіх храмаў – візіты, нам удалося знайсці ўпамінанні пра іканастасы «na optykę malowane».

Гаворка ў гістарычных дакументах, відавочна, вядзецца пра ілюзорны жывапіс. Гэты прыём узнік у эпоху барока, шырока выкарыстоўваўся ў тагачасным еўрапейскім мастацтве і праз каталіцкую традыцыю патрапіў на беларускія землі. Да цяперашняга часу захаваліся роспісы некаторых касцёлаў, выкананыя пераважна ў сярэдзіне – другой палове XVIII ст. Для іх характэрна выкарыстанне жывапісных прыёмаў такім чынам, каб на плоскасці сцяны (або размешчанага на сцяне драўлянага шчыта ці кавалка палатна) стваралася ўражанне, ілюзія аб'ёму. Так, архітэктурныя канструкцыі і скульптуру, характэрныя для рэтабля алтара, замяняла выява, напісаная на плоскасці. Шыкоўны сценапіс, створаны пры выкарыстанні названага прыёму, можна ўбачыць у каталіцкіх бажніцах Нясвіжа, Будслава[8]. Алтары для касцёлаў, выкананыя ў такой тэхніцы, з'яўляюцца даволі вядомай з'явай, якая атрымала пэўную ўвагу з боку даследчыкаў. Аднак пра існаванне ілюзорных іканастасаў дагэтуль не было ніякіх звестак і ўвогуле выяўленне ў архіўных дакументах такіх апісанняў ставіць перад мастацтвазнаўцамі новыя задачы. Паўстае асноўнае пытанне: як былі зроблены «аптычная» іканастасы і як яны выглядалі?

Самая ранняя згадка пра такога роду іканастас ва ўніяцкім храме, якая нам на дадзены момант сустрэлася, датычыцца царквы Пераўтварэння Божага ў г. Нясвіжы (Мінская вобласць) за 1784 г. У візіце пра гэтую сакральную канструкцыю гаворыцца: «Carskie drzwi snicerskiey roboty... przy nich drzwi sywerskiech dwoie, nad nimi ikonostas stolarskiey roboty na optykę malowany»[9]. Цікавасць уяўляе тое, што дадзены іканастас, па ўсёй верагоднасці, меў «разарваную» канструкцыю.

Так, з гістарычных крыніц нам вядома безліч выпадкаў, калі іканастас складаўся з мясцовага чына, усталяванага на падлозе, і верхніх ярусаў, прымацаваных, верагодна, да бэлек пад столлю. Ёсць падставы меркаваць, што паміж ніжнім і верхнімі радамі мелася пэўная адлегласць, якая дазваляла ў глыбіні вімы пабачыць галоўны алтар. Апошні, як праява лацінскіх традыцый, існаваў у пераважнай большасці ўніяцкіх храмаў у XVIII – пачатку XIX ст. і даволі часта суіснаваў адначасова з іканастасам. На жаль, з уніяцкіх часоў не захаваліся іканастасы, якія б давалі ўяўленне пра выгляд сакральных аб'ектаў, ахарактарызаваных намі як «разарваныя». Аднак пра іх існаванне сведчаць шматлікія апісанні ў тагачасных гістарычных крыніцах[10]. На нашую думку, менавіта такая структура іканастаса была выпрацавана з мэтай зрабіць даступным для агляду вернікаў алтар у віме, што з'яўлялася альтэрнатывай зняцця з іканастаса Царскай Брамы.

Вяртаючыся да «аптычнага» іканастаса ў Нясвіжы, адзначым, што першы яго ярус уключаў у свой склад Царскую Браму, дыяканскія дзверы і чатыры абразы, перароблены з дапамогай падстаўных менсаў у алтары; а ўверсе пад столлю не злучаныя з мясцовым ярусам знаходзіліся астатнія чыны. Іх выгляд можна паспрабаваць сабе ўявіць. Па ўсёй верагоднасці, на вялікім шчыце, зробленым з дошак, былі напісаны Апосталы, і, магчыма, Прарокі або Святы Божыя, а таксама жывапіснымі сродкамі была зроблена імітацыя калон, перагародак паміж выявамі, бэлек паміж «ярусамі». Усё было напісана фарбамі на плоскай паверхні, ствараючы ілюзію аб'ёму.

Верагодна, таксама «разарваны» іканастас з «аптычнай» верхняй часткай знаходзіўся ў 1784 г. і ў іншай царкве Нясвіжскага дэканату – у храме Апекі Божай Маці і Святога Мікалая в. Радкава (зараз – вёска ў Салігорскім раёне Мінскай вобласці). Пры яго апісанні адзначаецца, што ўнізе знаходзілася Царская Брама, паабапал якой два «мясцовыя» алтарыкі з абразамі Міколы і Божай Маці, а ўверсе: «Jkonostas czyli Dejsus z różnych apostołow złożony na optykę malowany»[11].

Наступны па храналогіі дакумент, дзе нам сустрэліся згадкі пра ілюзорны іканастас – візіта 1801 г. царквы Міхаіла Арханёла в. Блудзень (зараз – в. Першамайская Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці) Пружанскага дэканату на Брэстчыне. Тут, пра што сведчыць генеральная візіта, у 1801 г. знаходзіўся «jkonostas na płotnie pod optykę malowany»[12].

Цікавасць выклікае тая акалічнасць, што ў дадзеным выпадку галоўны сакральны аб'ект храма быў напісаны не на дошках, што з'яўляецца для яго традыцыйным, а – на палатне. Відавочна, што ён быў створаны паміж 1760 і 1800 гг., так як у вядомай нам крыніцы за 1759 г. пра яго згадак няма. А ў той час у храме на месцы іканастаса знаходзіліся «balki drewniane, prostey roboty»[13]. Акрамя таго адзначаецца, што ў царкве маюцца абразы са старога іканастаса. Магчыма, бэлькі, пра якія ішла размова ў візіце сярэдзіны XVIII ст., у храме знаходзіліся часова, пакуль не быў уладкаваны новы, ілюзорны, напісаны на палатне іканастас.

Яшчэ адзін прыклад ілюзорнага іканастаса, напісанага на палатне, які, аднак, належыць, відавочна, да іншай лакальнай з'явы, зафіксаваны ў 1822 г. у Рагачоўскім дэканаце ў в. Быч (зараз – в. Акцяброва Кармянскага раёна Гомельскай вобласці). Пра іканастас адзначаецца, што ён высокі, «optycznie malowany» на палатне, з разьбяной Царскай Брамай і гладкімі дыяканскімі дзвярыма[14]. На жаль, даволі складана ўявіць гэтую канструкцыю, але верагодна, што з драўляных дошак быў зроблены каркас, на які было нацягнута палатно. Яно і служыла асновай для жывапісу. Неабходна адзначыць, што такога роду іканастас ў Бычы з'явіўся ў пачатку XIX ст. Так, у адзначанай крыніцы гаворыцца, што царква пабудавана ў 1814 г. Тады, па ўсёй верагоднасці, і быў напісаны ілюзорны іканастас.

Усе прыведзеныя вышэй прыклады сведчаць пра існаванне ілюзорных іканастасаў у розных рэгіёнах і не даюць магчымасці сцвярджаць пра наяўнасць пэўнай лакальнай з'явы. Не вядома, хто і калі выконваў такія іканастасы. Адзінае, што з дакладнасцю можна сцвярджаць, дык гэта тое, што такі спосаб выканання быў вядомы ў апошняй трэці XVIII ст. Больш раннія прыклады на дадзены момант не выяўлены. Аднак больш познія крыніцы, якія асвятляюць стан храмаў Віцебшчыны ў 1820 г., сведчаць пра існаванне ў гэтым рэгіёне ў названы перыяд некалькіх ілюзорных іканастасаў, што наводзіць на думку пра іх прыналежнасць да агульнай мясцовай мастацкай з'явы, а магчыма – і пра адных і тых жа майстроў-выканаўцаў.

Так, з апісанняў у гістарычных крыніцах вынікае, што, напрыклад, у 1822 г. у Мікулінскім дэканаце Полацкай епархіі дзве царквы мелі ілюзорныя іканастасы: у Мікалаеўскім храме ў Пагосцішчах і Успенскім – у Дабрамыслі (зараз – абедзве вёскі ў Лёзненскім раёне Віцебскай вобласці). Гэтыя характарыстыкі, змешчаныя ў пратаколах праверак,

з’яўляюцца надзвычай цікавымі, таму тут мы іх прывядзём цалкам. У першай з названых галоўны сакральны аб’ект інтэр’ера апісваецца наступным чынам: «Ikonostas nowy stolarskiey roboty na optykę malowany i mieyscoma złocony, z Carskiemi i Sewernemi drzwiami, z Namiestnemi Spasytela i Bohorodycy obrazami, a po róznych miescach tego jkonostasa malowano różne Historii Pisma Sw. Nad Carskiemi Drzwiami figura Ducha Sw...w postaci gołębicy, nad tem w górze obraz Boga Oyca; na drzwiach sewernych z Prawey strony odmalowano Aarona Kapłana, a w górze Sw Pawła Apostoła, z lewey strony S. Móysija, a nad temi Sw Piotra Apostoła, obok Carskich drzwiów dwa obrazki nie wielkie w sietkach miednych pozłacanych Nay: Panny i Spasytela. <...> Jkonostas i żertownik konsekrowane... roku 1818 maja 11 dnia...»[15]. Гэты надзвычай цікавы запіс дае магчымасць не толькі ўявіць, як выглядаў іканастас, а, што ўвогуле каштоўна, сведчыць пра час яго стварэння – іканастас быў асвечаны 11 мая 1818 г., а значыць усталяваны не за доўга да гэтай даты.

Падобныя звесткі ўтрымліваюцца ў візіце царквы ў Дабрамыслі таго ж Мікулінскага дэканату: «Ikonostas stolarskiey roboty na optykę malowany nowy, z Carskiemi i Sewernemi drzwiami, z Namiestnemi Spasytela i Bohorodycy obrazami, pod któremi także po jednym obrazku maleńkim, jako to: Podroż Józefa z Betleiema do Egiptu, i Hystoria Samarytanki; tudzież nad Carskiemi drzwiami figura Ducha Sw w postaci gołebicy... nad tem w gurże obraz Tayney Weczery, wyżey zaś obraz zdięcie z Krzyża Pana Jezusa... na drzwiach sewernych jkonostasa z prawey strony obraz Sw Jana Chrzciciela, nad temi S. Michała Archanioła, i Sw Piotra Apostoła, z lewey strony Sw Archydyakona Stefana, nad temi Sw Jerzego i Sw Pawła Apostoła... <...>. który to jkonostas i żertownik są konsekrowane w roku 1820 m męca 9bra 8 dnia»[16]. Падобны спосаб вырабу іканастаса і час яго ўзвядзення ў двух суседніх храмах дазваляюць выказаць думку, што абодва названыя сакральныя аб’екты ствараліся аднымі і тымі ж майстрамі, якія на пачатку XIX ст. працавалі ў ваколіцах мястэчка Лёзна на Віцебшчыне.

Аднак такая традыцыя магла ўзнікнуць і раней. У бажніцы Пераўтварэння Божага в. Дарагакупава, якая знаходзіцца ў 15 км ад Віцебска (зараз вёска ў Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласці), іканастас быў выкананы аналагічным чынам: «Jkonostas na optykę malowany»[17]. Праўда, пра абразы, якія ў ім знаходзіліся, адзначаецца, што яны напісаны на палатне. Гэта датычыцца выяў у мясцовым чыне (па

сюжэтах не згадваюцца) і «Апосталаў», размешчаных у другім ярусе. Пра храмавы будынак адзначаецца, што ён узведзены ў 1776 г. Магчыма, што недзе ў гэтыя ж даты і быў выкананы іканастас.

Падобныя думкі можна выказаць і адносна суседняга храма, які знаходзіцца ў в. Астроўна Задзвінска-Бешанковіцкага дэканату ў 5 км ад Дарагакупава (зараз вёска ў Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласці). Тут «Jkonostas stolarskiey roboty na dwie kondygnacye, z których druga umieszczona in prezbiterium nad mensą, z Carskiemi y Siwirnemi drzwiami z Namiestnemi SS. Apostołow y Prorokow obrazami na optykę malowany»[18]. Пра царкоўны будынак ў візіце 1822 г. адзначаеццца, што ён узведзены недзе 40 гадоў таму. Атрымліваецца, што бажніца была пабудавана недзе ў 1780-ыя. Верагодна, як і ў папярэднім выпадку, іканастас быў наўмысна зроблены для новай царквы, а значыць і ён можа датавацца прыблізна 1780-ымі. Такім чынам, мы маем два прыклады адной і той жа з'явы, зафіксаванай у пэўным акрэсленым рэгіёне ў адзін і той жа час: магчыма, у другой палове 1770-х – пачатку 1780-х у 15 км на захад ад Віцебска у двух суседніх наваўзведзеных цэрквах былі ўладкаваны ілюзорныя іканастасы, праўда, звяртае на сябе ўвагу розная тэхніка выканання абразоў: у першым выпадку на палатне, а другім – на дошках.

Яшчэ адзін прыклад, які можа дапоўніць два прыведзеныя пра «Jkonostas na optykę malowany», гіпатэтычна выкананы ў апошняй трэці XVIII ст., датычыцца аднаго з Віцебскіх храмаў. Так, у Троіцкай царкве г. Віцебска знаходзіўся «Jkonostas z deszek na optykę malowany z Carskiemi i Sewernemi drzwiami z namiestnemi w onym Spasytela i Bohorodicy obrazami»[19]. Паводле меркавання даследчыкаў, новы будынак названай царквы быў узведзены ў 1761 г. на месцы, дзе з 1618 г. існаваў першы храм[20]. Верагодна, у хуткім часе пасля будаўніцтва і быў выкананы іканастас. Але на дадзены момант гэта можна выказаць толькі як здагадку. Але цалкам верагодна, што ў Віцебску, Дарагакупава і Астроўне іканастасы былі зроблены не адразу ж пасля ўзвядзення бажніц, а праз некаторы час. Магчыма, што стварэнне тут ілюзорных іканастасаў належыць тым жа майстрам, што ў 1818–1820 гг. працавалі на ўсход ад Віцебска ў ваколіцах Лёзна.

Уяўленне пра выгляд гэтых сакральных канструкцый дае ўнікальны здымак 1915 г. (іл. 1)[21], на якім адлюстраваны іканастас Віцебскай Троіцкай царквы. Названы храм заняпаў у пачатку XX ст., але не за доўга да гэтага Л. Д. Нікольскім была зроблена фатаграфія іканастаса.




*Іл. 1. Іканастас Троіцкай царквы ў г. Віцебску. Фота Л. Д. Нікольскага, 1915 г.*

*(Аўтар выказвае шчырую падзяку даследчыцы ўніяцкай архітэктуры І. Ажэшкоўскай за прадастаўленне электроннай копіі фотаздымка 1915 г.; арыгінал захоўваецца ў фотаархіве Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу).*

Каштоўнасць кадра заключаецца ў тым, што ён дае магчымасць уявіць, як выглядалі ілюзорныя іканастасы, існаванне якіх было характэрна для ўніяцкіх цэркваў розных рэгіёнаў Беларусі ў апошняй трэці XVIII – пачатку XIX ст.

Па фатаграфіі бачна, што прадстаўленая канструкцыя была сфарміравана драўлянымі шчытамі, у якія былі ўстаўлены: у мясцовым чыне – Царская Брама, двое дыяканскіх дзвярэй, абразы «Божая Маці» і «Ісус Хрыстос»; у верхніх ярусах толькі цэнтральныя іконы (размешчаныя па вертыкалі на восі сіметрыі) «Дэісус» і «Багародзіца на троне». Выявы Апосталаў размешчаны ў два шэрагі, і складваецца ўражанне, што гэта не адзін апостальскі чын, а два рады. Тое ж самае датычыцца і выяў Пракорокаў, прадстаўленых у круглых клеймах у самым версе іканастаса. Па гэтай прычыне можа скласціся ўражанне, што іканастас пяціярусны (па колькасці радоў з выявамі біблейскіх персанажаў), аднак калі ўгледзецца ў яго сюжэтную праграму, дык робіцца зразумелым, што дадзены ілюзорны іканастас з'яўляецца трох'ярусным і складаецца з мясцовага, апостальскага і прарочага чыноў.

Традыцыйна завяршае яго «Укрыжаванне з перадстаячымі». Як правіла, ў іншых іканастасах, што вядома па захаваных помніках і апісаннях у гістарычных крыніцах, яно было выканана аб'ёмна і прадстаўлена скульптурамі. Аднак у дадзеным выпадку, наколькі магчыма меркаваць па фотаздымку, перад вернікамі ўсё ж паўставаў і ў самым навершшы іканастаса прыклад выкарыстання ілюзорнага жывапісу: плоская, выразаная па форме дошка, была распісана так, што стварала ўражанне аб'ёму.

Прывабліваюць ураджанне, прадстаўленыя на здымку, і рэшткі колішніх бакавых алтароў, перарobленыя, відавочна, пасля скасавання Уніі ўківоты. Левы, па ўсёй верагоднасці, таксама быў зроблены пры выкарыстынні прыёму ілюзорнага жывапісу. Калі ўважліва прыгледзецца, дык можна пабачыць, што аздобы гэтага алтара: калоны паабапал цэнтральнай выявы, раслінны малюнак паміж ярусамі і па краях іх; анёлы, якія «падтрымліваюць» картуш у навершшы алтара – усё намалявана. Пры гэтым відавочна, што майстар ставіў перад сабой задачу не проста напісаць фарбамі ўпрыгожанні, а – стварыць уражанне аб'ёму. Што яму, уцэлым, удалося.

Вяртаючыся да пытання пра ілюзорныя іканастасы, адзначым, што ва ўсіх вядомых выпадках адносна Віцебшчыны гаворка ідзе прыблізна

пра агульны перыяд стварэння. Хаця ў Дарагакупаўскай царкве, па ўсёй верагоднасці, працавалі іншыя майстры, бо іканастас выкананы не на дошках, як у астатніх храмах гэтага рэгіёну, а на палатне.

Абагульняючы вышэй прыведзеныя прыклады адносна існавання ва ўніяцкіх бажніцах іканастасаў «pod optykę malowany», трэба адзначыць, што з’ява гэтая, па ўсёй верагоднасці, узнікла ў другой палове ці нават у апошняй трэці XVIII ст. і была ўласціва храмам розных рэгіёнаў. Ілюзорныя іканастасы ствараліся як на дрэве, так і на палатне. Унікальны здымак інтэр’ера Віцебскай Троіцкай царквы дае магчымасць уявіць, як выглядалі ілюзорныя іканастасы (а таксама – ілюзорныя алтары) ў беларускіх уніяцкіх храмах. Падкрэслім, што да гэтага часу звестак пра такія сакральныя аб’екты ўвогуле не было, і дадзены артыкул – першая спроба ўвесці ў навуковае карыстанне матэрыялы, якія сведчаць пра існаваненне на беларускіх землях такой унікальнай мастацкай з’явы як іканастасы «pod optykę malowane».

[1] Флікоп Г. А. Існаванне іканастасаў у грэка-каталіцкай царкве ў XVII – першай палове XIX ст. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Мн.: Беларуская навука, 2013. (Серыя гуманітарных навук). – № 4. – С. 81-87;

Флікоп Г. А. Іканастасы ўніяцкіх храмаў Тураўскай епархіі ў 1770–1780-я гады: наяўнасць і канструкцыя // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі; Навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мн.: Права і эканоміка, 2012. – Вып. 12 С. 588-593.

[2] Хадыка А. Ю., Хадыка Ю. В. Рэнесанс у беларускім новым іканапісе // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 62-70.

[3] Описи ризницы Турово-Пинской епископии (1585-1615 гг.) / Падрыхтаваў Ю. М. Мікульскі // Беларуская даўніна. – Выпуск 2. – С. 179-200.

[4] Ярашэвіч А. А. Іканастас // Рэлігія і царква на Беларусі // Энцыкл. давед. / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш.; Маст. А. А. Глекаў. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 126.

[5] Ярашэвіч А. А. Уступ // Алтарны жывапіс Беларусі XVIII-XIX стагоддзяў [Электронны рэсурс]: віртуальная версія выставы «Алтарны жывапіс Беларусі XVIII-XIX стагоддзяў» у Нацыянальным мастацкім музеі 23 лютага – 10 чэрвеня 2009 г. – Мінск: Нацыянальны мастацкі музей, 2009. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

[6] Ожешковская И. Н. Интерьер Петропавловской церкви в Березвечье как образец синтеза восточных и западных христианских традиций //

Архитектура: Сб. науч. тр. / Белорус. нац. техн. ун-т; Под ред. А. С. Сардарова. – Минск, 2015. – Вып. 8. – С. 255-260; Яе ж. Идеологическая программа Ф. Гребницкого в церковной архитектуре Великого княжества Литовского // Архитектура. Вестник архитектурного факультета БНТУ: Сб. науч. тр. / Белорус. нац. техн. ун-т; Под ред. А. С. Сардарова. – Минск, 2010. – Вып. 3. – С. 46-50.

[7] Габрусь Т. В. Мураваныя харалы: сакральная архітэктура беларускага барока. – Мінск: Ураджай, 2001. – С. 178-179.

[8] Нясвіжскі касцёл Божага Цела / Аўтар тэксту В. Дз. Бажэнава. – Мн.: Беларусь, 2006. – 96 с.; Будслаўская базіліка Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі / Аўтар тэксту А. А. Ярашэвіч. – Мн.: Беларусь, 2005. – 79 с.

[9] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 3245. – Воп. 7. – Спр. 3 (Візіты Клецкага і Нясвіжскага дэканатаў). – 1784. – Арк. 91 адв. – 92 адв.

[10] Флікоп Г. А., Флікоп Г. А. Іканастасы ўніяцкіх храмаў Беларусі XVII – пачатку XIX ст.: колькасць чыноў і іх змест // Історія релігій в Україні: науковий щорічник / упоряд. О. Киричук, М. Омельчук, І. Орлевич. – Л.: Львівський музей історії релігії, вид-во «Логос», 2015. – Книга 2. – С. 324-334.

[11] НГАБ. – Ф. 3245. – Воп. 7. – Спр. 3 (Візіты Клецкага і Нясвіжскага дэканатаў). – 1784. – Арк. 177 адв.

[12] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна. – Ф. 31. – Воп. 2. – Спр. 436 (Дело о передаче в казну им. Блудень Пружанскага уезда, принадлежавшего Блуденской православной церкви). – Арк. 18.

[13] Lietuvos valstybes istorijos archyvas. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 48. Wizyja generalna Prużańskiego, Kobryńskiego, Poliskiego, Kamieneckiego y Włodawskiego dyecezyi Brzeskiey dekanatów. – 1759. – S. 58.

[14] Российский государственный исторический архив. – Ф. 824. – Оп. 2. – Д. 184. Wizyty dekanatow Rohaczewskiego i Homelskiego. – 1822. – Л. 107.

[15] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1410. Wizyty dekanatów: Witebskiego, Wieliżskiego, Wielaszkowskiego, Mikulinskiego i Zadzwińsko-Bieszenkowskiego. – 1822. – Арк. 174.

[16] Тамсама. – Арк. 176.

[17] Тамсама. – Арк. 71.

[18] Тамсама. – Арк. 188.

[19] Тамсама. – Арк. 13.

[20] Кулагін А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыкл. давед. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 231.

[21] Институт истории материальной культуры Российской академии наук. – Фотоархив. – Сигнатура II. 85592. Никольский Л. Д. Фотография иконостаса церкви Св. Троицы в г. Витебске, 1915 г.